**КОРЗАН Людміла Мікалаеўна.** Нарадзілася 3 сакавіка 1952 г. у в. Плоскінь Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і служачых. Беларуска. Скончыла факультэт фізвыхавання Брэсцкага педінстытута па спецыяльнасці "Фізічнае выхаванне" з наданнем кваліфікацыі "Настаўнік фізічнага выхавання" (1973). Працавала асістэнтам (1973–1994), старшым выкладчыкам (1994–2000) кафедры фізвыхавання БрДУ. У 2000–2012 гг. – старшы выкладчык кафедры фізічнай культуры. Аўтар звыш 40 навуковых, вучэбна-метадычных публікацый, у т. л. трох вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў.

***Навуковыя інтарэсы:*** праблемы фізкультурна-аздараўленчай работы з насельніцтвам, тэорыя і методыка фізвыхавання, спартыўная трэніроўка і аздараўленчая фізічная культура. ***Асноўныя публікацыі:*** Особенности проведения занятий по физическому воспитанию студентов, страдающих близорукостью : метод. рекомендации. Брест, 1997 (у суаўт.); Утренняя гигиеническая гимнастика в режиме дня студентов : метод. рекомендации. Брест, 2002 (у суаўт.).